*Пісьменнік і вайна*

# ФРАНТАВЫЯ І ЛІТАРАТУРНЫЯ СЦЯЖЫНЫ МІХАСЯ ДАНІЛЕНКІ

Міхась Даніленка нарадзіўся ў 1922 г. у в. Ястрабка Лоеўскага раёна ў сялянскай сям'і. У трохгадовым узросце разам з бацькамі пераехаў у вёску Бодры. Скончыў Баршчоўскую сямігодку (1938) і паступіў у Рэчыцкае педвучылішча. Менавіта тут і далучыўся да мастацкага слова – у мясцовай раённай газеце "Зара камуны" з'явіліся яго першыя публікацыі. Думаў напісаць яшчэ некалькі твораў. Ды час разважыў інакшай. Надышоў чэрвень страшнага 1941-га.

Дакумент аб заканчэнні вучылішча М. Даніленка атрымаць не паспеў – пачалася вайна. Вучыўся ў запасным палку ў Казахстане, быў знішчальнікам танкаў. У маі 1942 г. кантужаным трапіў у палон, адкуль уцёк у 1944 г. Праз год вярнуўся дадому. Працаваў настаўнікам Казярожскай сямігадовай школы Лоеўскага і Ясеньскай сярэдняй школы Асіповіцкага раёна. Міхась Пятровіч любіў настаўніцкую працу. Неаднойчы згадваў, што ў Казярогах яму добра працавалася: днём вучыў дзяцей, а па вечарах ствараў апавяданні. Пра гэта потым хораша напісаў у навелах і ўспамінах. Любіў выхаванцаў, хоць яны былі няўрымслівымі і неспакойнымі. У 1952 г. завочна закончыў Гомельскі педагагічны інстытут. З 1953 да 1982 г. – у рэдакцыі "Гомельскай праўды". Праца ў газеце дазваляла бачыць шмат цікавага ў жыцці, што потым клалася ў аснову мастацкіх твораў. У рэдакцыі часта даводзілася чытаць рукапісы аўтараў-пачаткоўцаў, для многіх Міхась Пятровіч быў настаўнікам. На працягу дзесяцігоддзяў ён кіраваў літаб'яднаннем пры абласной газеце, дзе кожны месяц друкавалася літаратурная старонка. Творца шчыра радаваўся, калі знаходзіў свежы, арыгінальны тэкст, быў проста шчаслівым, калі сустракаў сваіх хрэснікаў у рэспубліканскай перыёдыцы. Да гэтага часу дацэнт В. Ярац узгадвае, што клапатлівы Міхась Пятровіч дасылаў яму нумары газет з ягонымі вершамі нават у Грузію, дзе малады паэт праходзіў вайсковую службу. Цяпер на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, ганаровай граматай і дзвюма граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Выдатнік друку.

У творчасці М. Даніленка ў асноўным абапіраецца на ўласны жыццёвы вопыт і шматгадовую журналісцкую практыку. Гэта ўласціва як першай яго кнізе ("Мая песня"), так і наступным ("Майская навальніца", "Журлівіца" і інш.). Улюбёная форма – невялікае апавяданне, навела. Выкарыстоўваючы вялікі жыццёвы досвед і прафесійныя назіранні і высновы, ён у абмежаваных жанравых формах паказвае падзеі, актуальныя для многіх. Ягоныя героі – часцей за ўсё сціплыя людзі, якія імкнуцца жыць па агульначалавечых законах, гэтым яны блізкія і дарагія аўтару, бо і ён усё жыццё шукаў дабра і справядлівасці і служыў ім верна і аддана. Вера ў чалавека дапамагае Міхасю Пятровічу выстаяць і ў наш няпросты час.

Хоць і шмат часу прайшло пасля Вялікай Айчыннай вайны, М. Даніленка ніколі не зможа забыць тыя страшэнныя і адначасова гераічныя гады – і як салдат, і як пісьменнік, бо ён, як і большасць хлопцаў-равеснікаў з педвучылішчаў і пездінстытутаў, пайшоў не дзяцей вучыць, а Радзіму абараняць. Таму ў перыяд росквіту таленту М. Даніленкі – журналіста і пісьменніка (а гэта прыпадае на 1980-я) – тэма вайны становіцца вызначальнай у творчасці. Характэрная для яго кніга "Родная зямля" (1982), куды ўвайшлі аповесці і апавяданні. Адкрываецца яна амаль аўтабіяграфічнай аповесцю "Альпы", невыпадкова прысвечанай сябру Сцяпану Халайчаву, з якім аўтар уцякаў з палону. Сам Міхась Пятровіч, чалавек ужо даволі сталы, спрабуе зазірнуць у мінулае, па-новаму асэнсаваць пражытае.

Аўстрыйскія Альпы згадваліся пісьменніку перш за ўсё белымі снягамі, шлейфамі хмараў і туманоў. Але не толькі жывапісныя краявіды гор уздзейнічалі на беларускага хлопца, які вельмі часта потым параўноўваў прыгажосць чужой прыроды з някідкай роднай. Ён заўважыў, што ў Альпах амаль не чуваць птушыных спеваў, бо, відаць, птушкі не любяць гэтых сасновых лясоў, шум якіх заглушаецца грукатам горных рэчак. А можа, герой не чуў песняў, бо трапіў сюды зусім не па ўласнай ахвоце.

Аповесць "Альпы" – успаміны заслужанага настаўніка пра маладосць. Юнак з апошняга курса Рэчыцкага педвучылішча трапіў на фронт (як бачым, пісьменнік выразна падкрэслівае аўтабіяграфічную аснову твора). Міхась Пятровіч выкарыстоўвае прыём кантрасту для ўзмацнення псіхалагічна-эмацыйнага ўражання і для больш поўнага і ўсебаковага раскрыцця задумы. Так, апісваючы свой сыход з Рэчыцы, дзе ўжо гарэлі дамы і фабрыкі, а над горадам вісела цёмная заслона дыму, ён узмацняе пачуццё трывогі апісаннем спелага жыта ўздоўж шашы, ма-

тылёў на дзяцельніку, каршака ў небе, дзе толькі нядаўна былі варожыя самалёты.

Ды і сама вайна паказваецца аўтарам праз прызму ўспрымання маладзенькага хлопца, што ніяк не можа прымірыцца са смерцю, не можа паверыць, што юны лейтэнант, які толькі што па-сяброўску гаварыў з навабранцам, ужо ляжыць акрываўлены на плашч-палатцы, а хутка ягонае цела назаўсёды закапаюць у сырую зямлю. Асабліва ўражваюць яго ацалелыя кусты бэзу каля счарнелых печышчаў, нават страшна глядзець на гэтае блізкае суседства кветак і разбурэння. Або згадкі пра песню птушачкі: *"Салавей браў адну за другой ноты, і мне чамусьці яшчэ глыбей адчуваўся трагізм нашага становішча, хацелася думаць, што ўсё гэта вакол нас – страшны, прывідны сон".*

Трагедыя вайны ўвасоблена і ў аповесцях "Ля Дняпра, у другім эшалоне", у якой маці ідзе шукаць сыночка на фронт, "Штраус у апраметнай", "Казік Рамашкевіч".

Сутыкненне светлага, юнацкага, жыццёвага з тым пачварным, што нясе фашызм, становіцца важным прыёмам творчасці М. Даніленкі. Гэтая тэма яго ніколі не адпусціць, аўтар будзе звяртацца да яе ва ўспамінах, згадках, замалёўках і эсэ. Для яго не такія важныя надзённыя праблемы, бо ў пісьменніка свой унутраны гадзіннік гісторыі, з якім ён звярае пошукі ўласнай душы. Таму даволі часта ў яго творах спалучаецца ваеннае мінулае і сучаснасць, як гэта па-майстэрску ўвасоблена ў лірычным апавяданні "Родная зямля".

А вось як згадвае пісьменнік вяртанне на радзіму пасля вайны ва ўспамінах "Майскае сонца над Плаўэнам" (Літаратура і мастацтва. 2009. 8 мая): *"...Нямела сэрца, калі ўбачыў быльнёг па плечы чалавека, чорныя коміны печаў на месцы былой маёй вёскі Ястрабка на Лоеўшчыне. Я ішоў з салдацкім рэчмяшком за плячыма (нёс трохі мукі, рулончык паркалю ды яшчэ таго, што нам выдзелілі на складзе ў нейкім нямецкім горадзе) і разумеў: гэта трэба было літаральна ўсё ўзнімаць з попелу. Крыху палягчэла, калі на канцы вуліцы пачуў удары сякеры.*

*– А, Пятроў сын? – здзівіўся мужчына, які сядзеў на зрубе. – А казалі, што загінуў... Маці твая памерла, не дачакалася. Ідзі: бацька, мусіць, дома – абрадуецца...*

*У мяне захаваўся калектыўны здымак навучэнцаў другога курса Рэчыцкага педвучылішча. Юнакі і дзяўчаты – па сутнасці яшчэ дзеці – з наіўнасцю, яснымі вачыма глядзяць у фотааб'ектыў. Мы не ведаем, што праз год пачнецца самая страшэнная вайна. Пасля яе з усіх выпускнікоў-юнакоў з нашага класа у жывых застануцца толькі двое..."*



**Міхась Даніленка** (другі злева) **з членамі літаратурнага аб'яднання "Крынічка".**

Для дзяцей М. Даніленка выдаў кнігі "Вернасць слову", "Зачараваны гарлачык", "На вуліцы Сонечнай", "Ключы бабулі Зімы". Пісаў таксама вершы. Некаторыя з іх пакладзены М. Блюміным і Э. Логашам на музыку.

Паэтам у прозе, любімым настаўнікам застаўся Міхась Пятровіч у творах для самых маленькіх. Дзядуля Міхась адкрывае ім таямнічы, загадкавы і, галоўнае, прыгожы сусвет, дзе ўсё жывое. І ў гэтым прыгожым свеце трэба жыць па чалавечых законах, каб не парушаць агульнай гармоніі. Трэба клапаціцца пра параненага жаўрука ("Журка"), дапамагаць бабулі ("Салодкая цыбуля"), любіць людзей ("Мама"), шанаваць памяць тых, хто аддаў жыццё за цябе ("Імёны на граніце"). Тады ўсім: і маленькім, і вялікім, і звярам, і птушкам – будзе хораша на вялікай зямлі.

Жыве пісьменнік у Гомелі. Але як пачынаецца вясна, абуджаецца прырода, вяртаецца на родную Лоеўшчыну, да сваіх землякоў, дзеліць з імі радасці і праблемы.

Многія здзіўляюцца творчаму даўгалеццю Міхася Даніленкі. І цяпер ён друкуецца на старонках штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва", у іншай перыёдыцы. Праўда, апошнім часам усё часцей абірае невялічкія па аб'ёме формы, у якіх можна выказаць уласныя вывады і назіранні. Што ж, ён мае права, бо пісьменнік, пражыўшы на свеце і ўсяго пабачыўшы, становіцца філосафам. Ён друкуе ўспаміны, зусім нядаўна, да 65-годдзя вызвалення Беларусі, пісаў пра творцаў Гомельшчыны, што здабывалі Перамогу. Яго цікавіць, які след пакідае чалавек на зямлі, якую памяць пра сябе, што пра яго будуць гаварыць і думаць людзі праз пакаленні.

**Іван ШТЭЙНЕР,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры беларускай літаратуры
Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя Францыска Скарыны.

*Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.*